ДУА «ЕЛКАЎСКАЯ СЯРЭДНЯЯ ШКОЛА»

# РЭХА ШКОЛЬНАГА ЖЫЦЦЯ

Агульнашкольная газета Верасень 2021 Выпуск № 9

**У гэтым нумары:**

Дзень ведаў 1

Наш першы ўрок 2

Агульнашкольны дзень здароўя 3

Крэатыўны ўзрост 4

## Дзень ведаў

1 верасня 2021 года для 79 вучняў нашай школы празвінеў першы званок, які абвясціў аб пачатку



новага навучальнага года. Сёлета ў школу прыйшло 9 навучэнцаў - перашакласнікаў, якім старшыня СВК "Сынковічы" Дзешко Дзмітрый Аляксандравіч і старшыня прафкама СВК "Сынковічы" Якімец Ірына Аляксееўна ўручылі новыя школьныя партфелі. Старшыня гаспадаркі пажадаў здароўя і плённай працы не толькі першакласнікам, але і ўсім вучням і настаўнікам школы. Святар Сынковіцкага храма а.Віталій напомніў уісм аб духоўным жыцці школы і



прыхода. А пасля празвінеў першы залівісты званок і ўсе разышліся па класах. Віншуем педагогаў, навучэнцаў і іх бацькоў з новым навучальным годам і жадаем поспехаў і моцнага здароўя!

Аўтар: Семенюк І.

# Наш першы ўрок





Для дзевяці навучэнцаў нашай школы ўпершыню прагучаў школьны званок, які паклікаў іх у клас на першы ў жыцці ўрок. А як такую падзею пакінуць без увагі? Прадстаўнікі Зэльвенскага РАНС і Зэльвенскага РАУС наведалі першакласнікаў. Яны павіншавалі вучняў з пачаткам іх школьнага жыцця, нагадалі аб правілах паводзін на вуліцы і ў час узнікнення надзвычайных сітуацый. Напрыканцы першакласнікам былі ўручаны падарункі. Колькі радасці і захаплення было ў вачах дзяўчынак і хлопчыкаў!

Аўтар: Шчарбак І..



# Агульнашкольны дзень здароўя

11 верасня ў школе прайшоў агульнашкольны дзень здароўя. У рамках якога для вучняў 1-3 класаў былі арганізаваны "Рухомыя гульні", для 4-6 класаў - "Шкаліада", 7-11 – “Крос”.

Аўтар: Цітоў Я.









# Крэатыўны ўзрост

Што гэта за ўзрост? Разабрацца нам дапамаглі кіраўнікі фермерскай гаспадаркі “Верас” Ірына Янаўна і Міхаіл Францавіч Макеі, якія




запрасілі навучэнцаў нашай школы прыняць ўдзел у аднаіменным фестывалі. Вучням прапанавалі паказаць іх работу ў школьным музеі і расказаць аб рэчах з “Бабулінага куфра”. А таксама прэзентаваць традыцыйнае беларускае блюда – дранікі. Дэгустацыя прайшла на “ура”! Мы лічым, што выдатна справіліся з задачай! Акрамя таго моладзь мела магчымасць пагутарыць з людзьмі сталага ўзросту, пацікавіцца іх захапленнямі і пераняць пэўны жыццёвы вопыт. Было вельмі цікава!

Аўтар: Семенюк І..

